


## НЕ КІЕМ, ДЫК ПАЛКАЮ...

Пра нас, беларусаў, кажуць, што мы талерантныя, што нам і гэтак добра, і так... Магчыма. Але ж не ўсім. Дзякаваць Богу, ёсць сярод нас людзі неабыякавыя, ёсць змагары. Яны розныя. Адны — ледзь што не па нораве — тэлефануюць, розныя заявы ў інстанцыі пішуць. Маўляў, прыедзьце, разбярыцеся, навядзіце парадак! Што, напэўна ж, правільна. Аднак дзейнічаць можна не толькі так, але і па-іншаму... Два прыклады.

У пасляваенныя гады ў цэнтры нашага Мядзела былі пасаджаны маладыя бярозкі, клёны ды іншыя дрэўцы. Там жа расла трава, прычым досыць нядрэнная...

Якраз гэта, відаць, згледзеў нейкі «гаспадар» і стаў прыводзіць на пашу казу.

Такой бяды, здавалася б, няхай... Калі б гэтая «бландзінка», апроч травы, не стала частавацца маладымі бярозкамі.

Іх трэба было ратаваць. А як?

Я прыдумаў: на невялікім лістку кардону «ад імя» казы напісаў вершык: «Усе дрэўцы я аб'ела, мусіць, штрафу захацела?»

Потым у гэтай «шыльдзе» зрабіў чатыры дзірачкі і ў іх працягнуў шнурок. А далей...

Разам з супрацоўнікамі мы дачакаліся, калі каза будзе ісці на пашу, запынілі яе, пачаставалі скарыначкай хлеба і, павесіўшы на рогі прыгаданую кардонку, падштурхнулі на тратуар.

Каза па звычцы «ўзяла курс» на цэнтр — да сваіх любімых бяроз.

Праўда, не адразу: паспрабавала пазбавіцца ад лішняга, стрэсці кардонку.

З гэтага, аднак, нічога не атрымалася. Ды і есці, відаць, «бландзінцы» хацелася больш. Таму каза пайшла па вуліцы, круцячы пры гэтым рагамі... І тым самым нібыта кожнаму дэманструючы надпіс.

Людзі спыняліся, чыталі яго, рагаталі... Нехта з іх, напэўна ж, ведаў, чыя гэта жывёліна, і сказаў гаспадару, што адбываецца.

Дзядзька прыйшоў — ці то праверыць, ці то паглядзець. І, убачыўшы, тут жа павёў «бландзінку» дамоў.

З таго дня казу пад дрэўцамі больш ніхто не бачыў. Гаспадар пасвіў яе ў нейкіх іншых месцах. Магчыма, зразумеў, што тут нельга, а можа і сапраўды пабаяўся штрафу?

Ім, дарэчы, многіх можна спалохаць.

...Раней ля аўтобуснага прыпынку ў тым самым Мядзеле была дошка для аб'яў. Свае паслугі на ёй тады ніхто, здаецца, не прапаноўваў, а вось тавары — было: нехта хату прадаваў, нехта — сячкарню, парасят, цялят... І ўсім добра: месца бойкае, падышоў, пачытаў — ведаеш.

Але ж, помню, дзядзька адзін вырашыў сарыгінальнічаць і сваю абвестку не на гэтай дошцы прыклеіў, а да дрэва, што побач цвікамі прыбіў. Ды такімі, што не выцягнуць...

Прыйшлося зайсці на пошту, купіць канверт і таму «арыгіналу» — прадаўцу каровы — ліст пасլаць. Так і так, маўляў, паважаны жыхар вёскі Навасёлакі, хутчэй прадавайце сваю рагулю і рыхтуйцеся заплаціць штраф за тое, што пашкодзілі цвікамі дрэва.

Ці паверыце — літаральна праз дзень ад той абвесткі нават следу не засталося! Бо яе гаспадар прыклеіў ля іншых — на спецыяльнай дошцы, а цвікі з дрэва акуратна выцягнуў абцугамі.

Так што наводзіць парадак можна не толькі з дапамогай заяў, але і звычайнага гумару. Паспрабуйце.

**Міхаіл Трафімавіч Чарняўскі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны,**
*к.п. Нарач, Мядзельскі раён.*

## НА ПАДСТУПАХ ДА КАНТРАКТА

Недарэчныя, непрадказальныя сітуацыі могуць узнікаць хоць дзе. А на працы і пагатоў. У мяне яны таксама былі. Нават смешныя.

...Наша, толькі заснаванае тады, прадпрыемства па вытворчасці штучных крышталёў тэхнічнага прызначэння, вабіла тады многіх. Іншаземцы, прынамсі, зачасцілі адразу і адусюль. З асабліва запамінальных былі госці з Канады, Кітая, Паўднёвай Карэі, Польшчы, Германіі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Расіі... Ды што там — мы над сталом начальніка нават карту павесілі і ў ёй чырвонымі сцяжкамі сталі адзначаць «завяваныя» намі замежныя краіны.

А самі ж ніякіх лінгвістычных інстытутаў не канчалі, сабраліся хто адкуль.

Як з іншаземцамі кантактавалі? Проста: інтэрнэт тады распаўсюджаным не быў, а вось факс ужо працаваў. Міжгароднія, міжнародныя званкі мы на слых вызначалі. Бывала, здымаеш слухаўку і адначасна не з-за блізкага свету чуеш:

— Алё, факс?

Ты ў адказ:

— Факс... Ессс!

І так гэта прыемна па-замежнаму «шпарыць»... Ну хоць вось гэтае «ессс»... І па тэлефоне... Бо калі іншаземцы прыязджалі, сустракалі іх ды вялі перамовы ўжо не мы: іншыя людзі, з дырэкцыі прадпрыемства. І толькі аднойчы... я.

Трэба ж было так здарыцца: у нейкі дзень усё наша начальства некуды раз'ехалася, усе супрацоўнікі без належнага кантролю трохі расслабіліся. А з прахадной, як на тое ліха, патэлефанавалі: сказалі, што да нас — чужаземец, мяркуючы па гутарцы — англічанін. Дык вы там думайце, маўляў, як прыняць.

А што думаць? Часу ж на гэта зусім няма: дзейнічаць трэба.

Як начальнік так званага сярэдняга звяна, агонь я прыняў на сябе. Па-англійску, праўда, ні бум-бум, але ж некалі ў школе вывучаў нямецкую... І нешта як быццам помню... То, думаю, няхай гэты лонданскі «дэндзі» ведае, што мы тут таксама не лыкам шытыя: няхай не паліглоты, але ж «шпрэхаць» можам, кацялкі нашы вараць.

З гэтымі думкамі я рашуча выйшаў на прахадную. Гляджу — нічога незвычайнага на тым госці няма: чалавек як чалавек, апрануты сціпла. Падаў руку яму: «гутен морген», маўляў. Не слухаючы адказу, далей кажу, што я «ніхт энгліш, іх шпрэхэ дойч».

Той, бачу, усміхаецца.

Я яго ў кабінет да сябе вяду, прапаную крэсла: «Зітцэн зі біттэ».

Гавару яшчэ, як мяне завуць... І магу яшчэ пра маму сказаць... А далей — ступар: ні слова, ні паўслова!

Але ж госць малайчына: сам пра нешта «чырыкае». Пра што — зусім не разумею, бачу хіба, што ён не злуецца, паводзіць сябе спакойна. Значыць, першую частку абавязковай праграмы пад умоўнай назвай «прыём кліента» я выканаў (ну не пакінуў жа госця стаяць за «вяртушкай»?)...

Выканаў бы, відаць, і наступныя, але ж апроч «хэндэ хох!» ды «Гітлер капут!» у галаве нічога няма.

Што рабіць? На шчасце, успомніў супрацоўніцу, якая някепска ведала англійскую, але была ў адпачынку. Набраў нумар яе тэлефона, папрасіў, каб яна распытала прыезджага, адкуль ён і з якою мэтай — слухаўку тут жа перадаў госцю. Той ажывіўся, узяўся ўсё тлумачыць — па-англійску, але ж я зразумеў, што ён... з Германіі.

Мне дужа няёмка стала, што гэтак каверкаў, няветлівы яго нямецкую!..

Але ж добра яшчэ, што «хэндэ хох!» не сказаў: мог бы на міжнародны скандал нарвацца. А так, дзякаваць Богу, пранесла.

Адзінае, што дзецям потым казаў, каб вучылі мовы. І сваю, беларускую, і, вядома ж, замежныя.

...А з тым госцем наша начальства потым сустрэлася. І кантракт яны падпісалі.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Кватэрнае пытанне

## КАЛІ ІНТЭРНАТ СТАНЕ ДОМАМ...

***Мы жывём у інтэрнаце, але ў ім, па сутнасці, такія ж кватэры, як і ў звычайным жылым доме. Напэўна, таму ў апошні час сярод жыльцоў сталі хадзіць чуткі, што занятыя намі памяшканні пасля 1 ліпеня 2016 г. будуць пераведзены ў разрад жылля камерцыйнага выкарыстання. Ці можна ў такім выпадку іх прыватызаваць?***

**А. Кірэй, Л.Сіз,** *г. Мінск.*

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.12.2013 г. № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін» (далей — Указ № 563) вызначана, што да 1 красавіка 2014 г. фонд жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання фарміруецца, у прыватнасці, за кошт уключэння ў яго склад адпаведных жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (у тым ліку заселеных) — службовых, спецыяльнага службовага жыллёвага фонду і спецыяльных жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Заселеныя непрыватызаваныя жылыя памяшканні, якія грамадзяне займаюць на ўмовах звычайнага дагавора найму жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, павінны былі пераведзены ў разрад жылля камерцыйнага выкарыстання ў перыяд з 1.04.2014 да 1.07.2016 г.

**Выкарыстанне інтэрнатаў для стварэння фонду жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання дзейным заканадаўствам не прадугледжана.**

Разам з тым, згодна са зменамі, унесенымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.11.2015 № 460 ва Указ № 563, дадаткова прадугледжана (падп. 2.3 1 п. 2 Указа № 563), што па ініцыятыве мясцовага выканаўчага і распарадчага органа (камунальны жыллёвы фонд), дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі (рэспубліканскі жыллёвы фонд) можа быць ажыццёўлена змяненне прызначэння будынка інтэрната на будынак шматкватэрнага жылога дома пры ўмове адпаведнасці жылых памяшканняў, размешчаных у гэтым інтэрнаце, патрабаванням, што прад'яўляюцца да кватэр.

У выпадку прыняцця мясцовым выканаўчым і распарадчым органам рашэння аб змяненні прызначэння будынка інтэрната на шматкватэрны жылы дом, жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, размешчаныя ў гэтым доме, у тым ліку заселеныя, падлягаюць уключэнню ў склад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання (у парадку, вызначаным у падп. 2.1 п. 2 Указа № 563) з наступным заключэннем адпаведных дагавораў найму жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду (у парадку, вызначаным у падп. 2.3 1 п. 2 Указа № 563).

Адначасова ўстаноўлена, што да 1 ліпеня 2016 г. наймальнік жылога памяшкання, уключанага ў склад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, які не падлягае высяленню з жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце ў адпаведнасці з п. 4 арт. 221 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, паўналетнія члены яго сям'і, а таксама іншыя грамадзяне, за якімі ў адпаведнасці з заканадаўствам захоўваецца роўнае з наймальнікам права валодання і карыстання гэтым жылым памяшканнем, маюць права звярнуцца з заявай аб прыватызацыі займаных жылых памяшканняў у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Віктар САВІЦКІ.**

■ Чалавек — чалавеку

# Касі... Пакуль малады!

**...Малому Андрэю карцела касіць. Дакладней, яму, як любому дзіцяці, хацелася быць дарослым, а касьба ж праца самая мужчынская?**





У гэтай сям'і менавіта мужчыны яе і рабілі. У Андрэя былі два старэйшыя браты, ды і бацька, дзякаваць Богу, вярнуўся з вайны на сваіх нагах і з рукамі...

Да таго ж у малога не было касы. Дакладней, была — старая. Ён сам як мог яе выклепаў, насадзіў на кассё. Але працаваць ёй было цяжка, і Андрэю дазвалялі адно — узмежкі абкошваць.

Хто ведае, колькі б так цягнулася, калі б аднойчы хлапчук не знайшоў... касу. Быццам бы добрую, але — без банькі. Мабыць салдаты, якія гналі скаціну з Германіі на ўсход, зламалі яе і кінулі пры дарозе як непрыдатную.

Азадачаны Андрэй кінуўся з ёй да каваля. Той, агледзеўшы знаходку, прызнаў, што каса добрая, нямецкая, што да ладу яе давесці можна, праўда, зараз на гэта часу няма.

Неамаведама як, але малы ўпрасіў-такі дзядзьку: той паправіў яму касу!

— Вось жа ўпарты! І куды так пнешся? — кпілі з малога браты. — Яшчэ накосішся!

А ў бацькі выбару не было: забраў Андрэеў здабытак, выклепаў, насадзіў на кассё... І пачалося.

Выйшлі яны ў поле, сталі касіць — роўненька, удвух. Але малы, Андрэй, мігам братоў абагнаў! Старэйшы Іван нават раззлаваўся, паспрабаваў адабраць у малога касу — бацька не дазволіў.

Прыйшлося ўзяць Андрэя на калгаснае поле пад Гранічамі. Там ён таксама ледзь не ўсіх абышоў, бо каса яго хадзіла роўненька, рэзала спраўна, не тупілася.

Увечары, як палеглі спаць (касілі некалькі дзён і начавалі ў полі) — інструмент паспрабавалі ўкрасці, але малы «адбіў».

Шанаваў яе. І касіў, аж пакуль не забралі ў войска.

Служыць хлапца з-пад Маладзечна накіравалі на Далёкі Усход і 4 гады не адпускалі, бо хадзілі чуткі пра вайну з Кітаем.

Факт, што калі вярнуўся, то касу пад страхою знайшоў, але ж даршыты сточаную. Зрабіў з яе нож — хоць так ды яшчэ карыстаўся.

...Пасля службы Андрэй ажаніўся з прыгажуняй Геняй і пасяліўся ў вёсцы Валодзькі Маладзечанскага раёна. Іх першая, старэйшая дачка стала потым маёй маці, а ён — маім любімым дзедам: спраўным гаспадаром, стваральнікам, на якіх трымаецца гэты край.

За доўгае працоўнае жыццё мой дзядуля Андрэй — Андрэй Васілевіч Карпіцкі — быў брыгадзірам паляводаў і будаўнікоў (ставіў дамы для людзей і хлявы для скаціны), працаваў на заводзе і нават запраўляў самалёты ў галоўным аэрапорце Беларусі. Апроч таго, яны з бабуляй заўжды трымалі вялікую гаспадарку, дзе было месца ўсім — ад курыцы да каня.

Я гэта да чаго? 25 чэрвеня ў дзеда Андрэя юбілей: яму 85 гадоў! Разам з ім гэту прыгожую дату будуць святкаваць жонка — Яўгенія Сцяпанаўна, з якой яны летась адзначылі шасцідзесяцігоддзе сумеснага жыцця, тры дачкі, шасцёра ўнукаў (чацвёра — ужо са сваімі сем'ямі) і 2 праўнукі, малодшаму з якіх тры месяцы.

Уся вялікая сям'я разам з аднавяскоўцамі шчыра віншуе Андрэя Васілевіча, жадае добрага здароўя і моцна ім ганарыцца.

**Андрэй ВІТУШКА.**
*г. Мінск*